# Там, дзе жыў Максім Багдановіч

У Горкаўскім дзяржаўным музеі А. М. Горкага адбылося пасяджэнне членаў таварыства старых ніжагародцаў, прысвечанае 75-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

З дакладам «Класік беларускай паэзіі» выступіў мясцовы паэт А. Бараховіч. Вось ужо колькі год ён займаецца вывучэннем і папулярызацыяй сярод рускіх чытачоў твораў Максіма Багдановіча. А. Бараховіч пераклаў цыкл вершаў беларускага паэта на рускую мову. Яны будуць неўзабаве апублікаваны ў альманаху «Волга».

Затым выступіў старшыня таварыства старых ніжагародцаў П. Сафійскі. Ён расказаў пра дружбу Аляксея Максімавіча Горкага з бацькам Максіма Багдановіча — Адамам Ягоравічам.

Цёпла сустрэлі прысутныя Анну Кіпрыянаўну Валасовіч-Гразнову, стрыечную сястру Максіма Багдановіча. Яна расказвала пра бацьку і сына Багдановічаў, падзялілася ўражаннямі ад паездкі ў Мінск на юбілей Максіма Багдановіча.

Сход членаў таварыства старых ніжагародцаў вырашыў хадайнічаць перад выканкомам гарсавета аб увекавечанні ў Горкім памяці Максіма Багдановіча. У музеі мяркуецца адкрыць куток класіка беларускай літаратуры.

Н. ВАТАЦЫ.